М.В.Шабовіч

# *ІМКЛІВІЦЬ – ЛЯВОНІЦЬ:*

МАТЭРЫЯЛЫ ДА СЛОЎНІКА АКАЗІЯНАЛЬНАЙ
ЛЕКСІКІ 20-Х–30-Х ГГ. ХХ СТ.

**ІМКЛІВІЦЬ (МКЛІВІЦЬ)**. Быць (рабіць) імклівым; утвараць дзеянне імкліва; спяшацца, прыспешваць: *Змрок* ***імклівіў*** *наўсцяж даліны...* (У.Дубоўка); *... далёка вока* ***ймклівіць*** *лёт* (У.Дубоўка); ***Імклівіць*** *зірк* (У.Дубоўка); *Час* ***імклівіў*** *кудысьці...* (У.Дубоўка); *На ўсіх ветразях карабель* ***імклівіць*** *на поўдзень яскравы* (У.Дубоўка); *І творчай працы радасны ўзлёт упарта* ***мклівіць*** *праз сягоння ў заўтра* (У.Дубоўка); *... думка* ***імклівіць ...*** *лёт* (У.Дубоўка); *... вятры асеннія* ***імкліваць*** *борам* (У.Дубоўка); *Ў пачуццях быў я неахайным, – яны сягоння не* ***імклівіць*** (Я.Пушча); *Над лесам зоры* ***мкліваць...*** (Я.Пушча); ***Імклівіць*** *час* (Т.Кляшторны); *Няхай імгла, няхай* ***імклівіць*** *восень...* (А.Александровіч).

**ІНШАСЦЬ**. Тое, што характарызуецца (вызначаецца) іншым: *Гэта поле* ***іншасцю*** *гарыць, гэта поле трактарам арэта* (У.Хадыка).

**ІРАНІЧНА-ЗЛАРАДАСНЫ**. Складаны прыметнік ад *іранічны* і *зларадасны*: *...гэта відаць было ... і ў няўлоўных* ***іранічна-зларадасных*** *усмешках…* (М.Зарэцкі).

**ІРЖАВІЦЬ**. Рабіць іржавым: *І дождждык іржавіў вінтовак павець...* (М.Лужанін).

**ІСКРАБРЫЗГ**. Тое, што нагадвае брызгі (пырскі) іскраў (ад *іскрамі брызгаць*): усплёск, феерверк: *Зноў чуцен* ***іскрабрызг*** *вясёлы дзіцячых звонкіх галасоў* (А.Жукоўскі).

**ІСКРАМЁТНА**. Ярка, зіхотка, іскрыста (ад *іскрамётны*): *Ой, баяліся й сівыя воўкі,* ***іскрамётна*** *лучынілі вокам…* (А.Вольны).

**ІСТУЖЛІВЫ**. Які характарызуецца істужкай, мае ўласцівасці істужкі: *Сакоча з вярбінай бяроза, старыя ўжо, мусіць, таксама... Над сцежкай* ***істужлівай***, *роснай усімі гамоняць ліресткамі* (У.Дубоўка).

**КАДРЫЛІЦЬ**. Утвараць дзеянне, якое нечым нагадвае кадрыль; танцаваць (кадрыль): *... там сягоння бадзёрым уздымам па-над постаццю жнеі* ***кадрыляць*** (П.Трус).

РЭПАЗІТОРЫЙ БГПУ

**КАКЕТЛІВА-ЎТОНЧАНА**. Складанае прыслоўе ад *какетліва* і *ўтончана* : *...Спосаб даюць. Хітра-дыпламатычна,* ***какетліва-ўтончана*** (Р.Мурашка).

**КАЛАСІЦЬ**. Праяўляць асаблівасці коласа: *... свабодай* ***калосяць*** *палі* (П.Трус); *... і пайду ў прыволле, дзе* ***калосіць*** *воля* (П.Трус); *І проста-проста сінь іх вачанятак* ***калосіць*** *нянавісць...* (А.Александровіч); *... шумы* ***калосяць*** *азім* (Я.Пушча).

**КАЛЮЧА-КУДРЫ**. Які мае калючыя кудры: *... імкнулася сюды, бы шквал сталёвы, няведамае племя,* ***калюча-кудрае****, віхрастае...* (З.Бядуля).

**КАЛЯІНІЦЬ**. Утвараць каляіну: *Чый конь іх* [шляхоў] *не таптаў і чый абоз не* ***каляініў*** (Т.Кляшторны).

**КАЛЯРАВАЦЦА**. Набываць (праяўляць) колер; становіцца каляровым; фарбавацца: *Трапятаннем асенніх зарніц –* ***каляруецца*** *ранены сцень* (М.Лужанін); *... і ў вачох – у блакітных палонках –* ***каляруецца*** *белая рань* (С.Дарожны)*; ... і* ***каляруюцца*** *галіны ў аксаміце...* (А.Бартуль).

**КАМСАМОЛІЦЦА**. Набываць прыметы камсамола; маладзець: ***Камсамолься****, сяліба ратая...* (З.Бядуля).

**КАМСАМОЛІЦЬ**. Рабіць (рабіцца, быць) такім, як камсамол; праяўляць асаблівасці камсамола: *Нябёсны цуд ён* [Акцябр] *рупна* ***камсамоліць...*** (З.Бядуля); *... сёння ў сонцы сэрца* ***камсамоліць*** (А.Вольны); *... прыемна: ты спеў* ***камсамоліш*** *стагоддзямі край што пяе* (А.Александровіч); *... сэрца пайшло* ***камсамоліць*** (А.Моркаўка); *...* *нават вецер і то* ***камсамоліць*** *над далонямі вуліц старых...* (Т.Кляшторны); *Нашых дзён залатая вясна не пакіне ў душы* ***камсамоліць*** (Т.Кляшторны); *Сёння ўсё на свеце* ***камсамоліць*** *ціхаструнным вогуллем вясны* (Т.Кляшторны).

**КАРМАЗЫНАВАСЦЬ**. Тое, што характарызуецца (вызначаецца) кармазынавым; чырвонасць (чырвань): *...* ***кармазынавасць*** *дзікіх малін* (У.Дубоўка); ***Кармазынавасць*** *вуснаў тваіх хто адвечнай маною паіў?* (М.Лужанін).

**КАРМАЗЫНІЦЬ**. Рабіць (рабіцца) такім, як кармазын; чырванець, пунсавець: *Асмугласць рук лягла на ногі, і* ***кармазыніць*** *вуснаў мак...* (У.Дубоўка); *У вітрынах* ***кармазыняць*** *вішні...* (З.Бандарына).

**КАРНАВАЛІЦЬ**. Праяўляць уласцівасці карнавалу; актыўна ўтвараць дзеянне: *...* ***карнаваліць*** *разам з камсамольцамі сонечны раённы камітэт* (А.Дудар); *...* ***карнаваліць*** *жыццём вызвалення векапомны Кастрычнік сягоння* (П.Трус); *Калі рака пад лёдам* ***карнаваліць*** *– ўбяруцца хутка ў зелень берагі!* (С.Хурсік).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**КАРОТКАВЕЧНЫ**. Які характарызуецца кароткім векам: *Прыйшоў канец і **кароткавечнаму** шчасцю Марылькі* (М.Зарэцкі).

**КВОЛА-РУЖОВЫ**. Які мае аслабленае адценне ружовага; ружававaты, светла-ружовы: *Ярка-чырвоны ўсход афарбаваў аснежаныя абшары і бела-пушыстыя гаёчкі ў **квола-ружовы** колер* (З.Бядуля).

**КВОЛІЦЬ**. Рабіць кволым; аслабляць: *Гады і дні ... прасцяг хвалююць, **кволяць**...* (У.Дубоўка); *Дык слухай, вёска, не скажу ніколі, што я твой ліст, вясной апаўшы, што сэрца маё восень **кволіць**...* (Я.Пушча).

**КОЖНАКРОКАВАСЦЬ**. Тое, што характарызуецца (вызначаецца) кожным крокам; высокая канцэнтрацыя, шчыльнасць (чагосьці): *Не дойдзеш да ладу: губляецца бераг, хаваюць сады **кожнакрокавасць** студняў* (М.Лужанін).

**КОЛЬКІСОТЛЕТНІ**. Якому некалькі (колькі) соцень гадоў (лет): *Усё ж **колькісотлетняя** паняверка, валачэнне ярма чужога ўладарства на сваім набалелым карку не прайшло для нас без ніякага знаку...* (Я.Купала).

**КРЫВАГОРБЫ**. Які крывы, нібы горб: *Ля настольніцы белае жытняй забражджэў **крывагорбы** сярпок* (А.Якімовіч).

**КРЫВІСТА**. Прыслоўе ад *крывісты* або *Крывія* (*крывічы*); па-беларуску, як падабае беларусам (крывічам): *Сядзьце роўна, жалязіста, мазаліста і **крывіста**...* (Я.Купала).

**КРЫЛІЦЬ**. Утвараць дзеянне пры дапамозе крылаў (падобна крылам); узносіць (у вышыню): *Вецер, братка яго* [Ізяслава] *кроў студзіць памагаў, чыстасць сэрца мацніць, чыстасць думкі **крыліць*** (М.Грамыка).

**КРЫЛЯЦЬ**. Утвараць дзеянне з дапамогай крылаў (падобна крылам); лунаць: *І неабдымнасцю **крылялі** абшары васільковых воч* (М.Хведаровіч); *Не стала Горкага, але **крыляць** высока над светам будзе Горкага імя* (А.Александровіч).

**КРЫНІЧНА**. Прыслоўе ад *крынічны* або *крыніца*; падобна крыніцы, як крыніца; няспынна, свежа: *... бурліцца **крынічна** жыццё навакол...* (Я.Купала).

**КРЫНІЧЫЦЦА**. Разлівацца (расцякацца) няспынна, як крыніца (ад *крынічыць* або *крыніца*): *... звонка **крынічыцца** смех над ракой...* (М.Машара).

**КРЫНІЧЫЦЬ**. Праяўляць уласцівасці крыніцы; цячы. Адпаведнік рускаму “бить ключом”: *Радасць хвалямі **крынічыць*** (А.Александровіч); *Заўсёды:*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*позна, рана* ***крынічыць*** *фабрычным жыццём* (А.Александровіч); *Дзе нядаўна пад прыгонам пот* ***крынічыў*** *на паноў, –- загула сталёвым звонам малатарня ў мужыкоў* (П.Трус); *Упіваўся крывёй малады брыгадзёр, што з грудзей поўных жыцця* ***крынічыла*** (П.Трус); *... жыццё* ***крынічыць*** *і музыкі граюць...* (У.Дубоўка); *... бадзёрасць навокал* ***крынічыць*** (У.Дубоўка); *Гукі тыя, здані той цёмнай ночы кроў* ***крынічаць*** (У.Дубоўка); *Чацвёрты год вялікі план стальной энергіяй* ***крынічыць*** (А.Дудар); *І ўспаміны чамусьці* ***крынічаць*** *над краінай ляснiстай маей!* (А.Вольны); *Дый на твары ў кожнай смех гуляе, радасць* ***крынічыць*** (М.Нікановіч); *Эх, дзявочыя сілы* ***крынічаць****!* (Я.Пфляўмбаўм); *... спеў бяроз* ***крынічыць*** (П.Броўка); *У небе ён* [хлапчук] *лічыць калматых кароў... Як гэта* ***крынічыць*** *ружовую кроў* (А.Моркаўка); *Эх вы, думкі золатазвонныя, эх ды стромені бяздонныя, век* ***крынічыць*** *у вас моладасць неўміручая, разгонная...* (Р.Суніца); *Што боль пякучых кпін... і гора, калі* ***крынічыш*** *сэрца ты* [краіна]*?* (М.Машара); *...* ***крынічыць*** *сэрца гневу муць* (М.Машара); *... з багнаў* ***крынічаць*** *крыніцы...* (М.Машара); *... і* ***крынічыць*** *вяснянкай маёвай чар жыцця у настроі маім* (М.Машара); ***... крынічыць*** *пад снегам вада* (М.Машара); *Жыццё* ***крынічыць*** *далей вірам...* (М.Машара); *З надзеяй тайнай штосьці шукаю і ў сэрцы чымсь* ***крынічыць*** *кроў* (М.Машара); *І ў сэрцы* ***крынічыць*** *песенная брэдзь* (М.Машара); ***... крынічыць*** *кроў уся агнём* (М.Машара); *Дык хай жа хмельна кроў* ***крынічыць*** (М.Машара); *У сэрцы хмельна кроў* ***крынічыць...*** (М.Машара).

**КРЫШТАЛІЦЦА**. Набываць уласцівасці крышталю; станавіцца такім, як крышталь: *Сыплюцца каплі вады і* ***крышталяцца*** *ў возеры сінім...* (П.Трус); ***Крышталяцца*** *срэбрам дрэвы, як прыгожыя ліхтарні* (А.Гурло); *Па-за акном* ***крышталяцца*** *зарніцы...* (Т.Кляшторны); *Пішаш ты, што* ***крышталіцца*** *восень наўкол* (Ю.Гадлеўскі); *... і* ***крышталяцца*** *ў сэрцы ўспаміны* (Ю.Гадлеўскі)

**КРЫШТАЛІЦЬ**. Рабіць (рабіцца, быць) такім, як крышталь (падобным на крышталь): *Каб гэта бясконца і жыць, і любіць, праменнем пярэстым* ***крышталіць*** (У.Дубоўка); *... расою* ***крышталіць*** *кілім аксамітны* (У.Дубоўка); *Будуць сінія вочы затое зноў узрочыстай казкай* ***крышталіць*** (У.Дубоўка); *Хай барвуюцца, хай* ***крышталяць****, як восень заніззю журавін* (У.Дубоўка); *Хай барвуюцца і* ***крышталяць****, можа ў іх напаткае прыгожае зірк...* (У.Дубоўка); *Цымбаламі гукі* ***крышталяць****, і іх не заглушыць гармонік* (У.Дубоўка); *Моц магутнай тайгі і яшчэ магутнейшай зямлі у напевах ягоных* [гімна] *плыве, брыльянцiцца,* ***крышталіць*** (У.Дубоўка); *Ціха хвалі* ***крышталілі*** *ў далі, –- ў пераліваx іх чуўся напеў* (Я.Пушча); *Яны ж* [кроплі вады] *моўчкі* ***крышталяць*** *кругі...* (Я.Пушча); *На дне жыцця яны* [гады] ***крышталяць*** *жывыя казкі старыны* (П.Трус); *Збіралі кволыя лілеі, слязьмі* ***крышталілі*** *пясок* (П.Трус); *Мая душа* ***крышталіць*** *дыяментам* (Я.Туміловіч); *І таму так* ***крышталіць*** *раса, абліваючы ногі босыя* (М.Дружына); *Зоры ў небе сінім* ***крышталілі****, адрываліся, ніклі кудысьці...*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

(А.Куст); *Ў высі* ***крышталяць*** *зораньki-вочы* (Ю.Таўбін); *А дзень такі гарачы, –* ***крышталіць*** *сонца даль...* (М.Машара).

**КУДЗЕЛІЦЬ**. Рабіць такім, як кудзеля (падобным на кудзелю): *І ўжо лог шырокі – ненарокам – хвост* ***кудзеліць*** *сівы* (Я.Пушча); *Кудлата-зялёныя хвалі чупрынаю кудзер* ***кудзеліў*** (Я.Пушча); *Як драмалі палі, а ў палёх ды туман ... жыта-рунь паліваў і* ***кудзеліў*** *твой стан, – мы ступалі далінай імглістаю* (П.Трус); *Вунь конь на іржонні* ***кудзеліць*** *траву...* (А.Моркаўка); *Чырвань, сінь павучыннем спавіты... І* ***кудзеліць*** *шэпт цьмяных слоў...* (Я.Пфляўмбаўм); *... вецер быў п'яны, малады,* ***кудзеліў*** *белы веер валос і бароды* (М.Машара).

**КУДЛАТА-ЗЯЛЁНЫ**. Складаны прыметнік ад *кудлаты* і *зялёны*: ***Кудлата-зялёныя*** *хвалі чупрынаю кудзер кудзеліў* (Я. Пушча).

**КУДРАВЕЦЬ**. Станавіцца (быць) кудравым: праяўляць уласцівасць кудравага; маладзець: *Сэрца яшчэ не астыла, буду яшчэ* ***кудравець*** (М.Хведаровіч).

**КУДРАВІЦЦА**. Станавіцца кудравым (ад *кудравы*): *... там гай, вольная рунь* ***кудравіцца...*** (П.Трус); *Хай жа радасць* ***кудравіцца...*** (М.Сямашка).

**КУДРАВІЦЬ**. Рабіць (быць) кудравым: *... маіх дзён ён* [сад] ***кудравіць*** *галопы* (У.Хадыка); *Маладняк зялёны бач* ***кудравіць****, ахіляе край яскравым лісцем* (М.Чарот); ***Кудравяць*** *стромкія бярозы* (А.Бартуль); *Вецер, вецер гне калоссе і* ***кудравіць*** *сенажаць* (М.Машара).

**КУДРЫЦЦА**. Утвараць кудры; праяўляць уласцівасць кудраў: ***Кудрыцца*** *золак палеткамі...* (Н.Чарнушэвіч).

**КУЛЬГАВА**. Прыслоўе ад *кульгавы*; арытмічна: *... на гадзіны* ***кульгава*** *ўскідаецца сэрца...* (М.Зарэцкі).

**КУЧАРАВА**. Прыслоўе ад *кучаравы*; віхляста: *Ды чамусьці журба-ліхадзейка* ***кучарава*** *у сэрца цякла* (А.Вольны).

**КУЧАРАВА-ДОЎГАВАЛОСЫ**. Складаны прыметнік ад *кучаравы* і *доўгавалосы*: *Яна* [Зося] *зачароўваецца шырокалістымі клёнамі,* ***кучарава-доўгавалосымі*** *русалкамі – бярозамі...* (З.Ліпнёвы).

**КУЧАРОЎЕ**. Зборны назоўнік ад *кучаравы*; сукупнасць кучаравага: *Акуталіся* ***кучароўем*** *застыўшых бяроз, што паапускалі васковыя гірлянды ў цішыню* (Я.Скрыган).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**ЛАНЦУЖНІК**. Той, хто жыве ў няволі, ланцугах; зняволены : *Не было раней ніколі, што вось ты – мужык лапцюжнік – (а учора быў* ***ланцужнік)*** *пераходзіш на шматполле* (П.Трус); *... няма ў ім* [напеве] *болей слоў* ***ланцужнік****...* (Я.Пушча).

**ЛАНЦУЖЫЦЬ**. Утвараць дзеянне падобна ланцугу (ланцугам); прыгнятаць, няволіць: *Ужо зламанасць* ***ланцужыць*** *даўно* (З.Бандарына).

**ЛАСКАВА-ТАЕМНА**. Складанае прыслоўе ад *ласкава* і *таемна*: *Ён* [Гуторскі] *усміхнуўся* ***ласкава-таемна****...* (М.Зарэцкі).

**ЛЕТАЦВЕТ**. Цвет лета, летні цвет: *Аддам сягоння ўсё ... каб кроплі буйных слёз на* ***летацвет*** *апалі...* (П.Трус).

**ЛЕТУЦЕНЬ**. Летуценне, мроя, мара (ад *летуценіць*): *І песня, нібы* ***летуцень,*** *заплача шчасцем на жалейцы* (М.Танк).

**ЛЁГКАВЕЙНЫ** (**ЛЕГКАВЕЙНЫ**). Які лёгка вее: *І скрозь туман пранеслася, як вецер* ***лёгкавейны*** (Я.Купала); *...* ***легкавейная****, кволая хуста...* (У.Хадыка).

**ЛЁГКАПЛЫННЫ**. Які характарызуецца лёгкай плынню: *У гэты дзень цвіло наўколле, быў* ***лёгкаплынным*** *кожны ўздых...* (Ю.Лявонны).

**ЛЁГКАЎЗНЯТЫ**. Які лёгка ўзняты: *Барковіч прыслухваўся, як расце ў ім тое* ***лёгкаўзнятае*** *пачуццё...* (М.Зарэцкі).

**ЛІЛОВА-ПУРПУРОВЫ**. Складаны прыметнік ад *ліловы* і *пурпуровы*: *...ў час* ***лілова-пурпуровага*** *світання нікчэмнай цвіллю знікла* [мінуўшчыны паданне]... (З.Бандарына).

**ЛІСТАВЕЯ**. Вея лістоў: ***Ліставея*** *не моўкне, шуміць...* (У.Дубоўка).

**ЛІСТАВЕЯЦЬ**. Веяць лістамі; выконваць дзеянне, якое мае адносіны да ліставеі (ліставеяю): *Вятры-юнакі* ***ліставеюць*** *на стромкіх узгор'ях...* (Я.Пушча).

**ЛІСТАПАДНЫ**. Які адносіцца да лістападу: *У* ***лістападны*** *дзень асенні, у дзень, спавіты туманамі, сяйбіт вясновага насення Чырвоны Сцяг падняў над намі* (З.Бядуля); *За акном шумела лісце ў* ***лістападным*** *жаўталісці* (З.Астапенка).

**ЛІХАМАНІЦЬ**. Рабіць такім, як ліхаманка (як у ліхаманку); трэсці (як у ліхаманцы): *На кані, на агністым кані,* ***ліхаманіць*** *зямлю красавік...* (У.Хадыка).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**ЛІХАМАНКАВА-БЛІСКУЧЫ**. Бліскучы, як у ліхаманку: *Ён* [Лясніцкі] ... *бачыў у распаленых **ліхаманкава-бліскучых** вачах чорную здань гвалтавання, пажараў, жудаснай дзікай анархіі* (М.Зарэцкі).

**ЛУЧЫНІЦЬ**. Утвараць дзеянне пры дапамозе лучыны (падобна лучыне); свяціць (свяціцца, асвятляць); грэць: *Сэрца радасць **лучыніць** усмешкай...* (Я.Пушча); *... і так шчыра **лучынілі** хаткі* (А.Вольны); *Успаміны у сэрцы **лучыняць*** (А.Вольны); *Ой, баяліся й сівыя воўкі, іскрамётна **лучынілі** вокам...* (А.Вольны).

**ЛЬНЯНАКУДРЫ**. Які мае (нагадвае) льняныя кудры; з кудрамі, як лён: *Вёска мая **льнянакудрая**, цябе трэба ў жалеза каваць* (А.Катановіч).

**ЛЮБА-ВЕТЛІВА**. Складанае прыслоўе ад *люба* і *ветліва*: *А зямелька, нібы шчаслівая маладзіца ў абоймах свайго каханка, песціцца і лашчыцца ды **люба-ветліва** ўсміхаецца* (М.Ніканові).

**ЛЮСТРАНІЦЦА**. Станавіцца (быць) люстраным: *Рань бялявай стралой прылятае – і **люстраняцца** срэбрам выгары* (Я.Журба).

**ЛЮСТРАВАЦЦА**. Праяўляць уласцівасці люстры; адбівацца: *Не грэюць восені агні, –- **люструюцца** квяцістаю палівай...* (У.Дубоўка); ... ***люструюцца** далі ў вадзе* (М.Лужанін).

**ЛЮСТРЫЦЬ**. Утвараць дзеянне падобна люстры; адбіваць: *Змрок смуглява-свежы у крыніцы **люстрыць** рань…* (Я.Пушча).

**ЛЮСТРЫЦЦА**. Адбівацца; блішчэць, зіхацець (як ад люстры): *Магутнасць, горкасць у руках **люстрыліся** гожых* (З.Бядуля); *Яснае сонца **люстрыцца** бясконца* (Я.Сівак).

**ЛЯВОНІЦЬ**. Утвараць дзеянне, якое нагадвае танец “Лявоніха”; танцаваць “Лявоніху”: *Беланогі, расчухраны месяц **лявоніць** у лісці кляновым...* (Я.Пушча); *І толькі вечарам ўзвіхрыцца віхар – пяе, **лявоніць** ля калін* (Н.Маркава).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ